# РАСТЛУМАЧЫЦЬ «УЭСТСПЛЭЙНЕРАЎ»: ЦІ МОЖА ЗАХОДНІ ДАСЛЕДЧЫК БЫЦЬ ЭКСПЕРТАМ ПА ЦЭНТРАЛЬНА-УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ?

**Аляксей Кажарскі**

DOI: https://doi.org/10.61095/815-0047-2024-2-145-155

EXPLAINING THE "WESTSPLAINERS": CAN A WESTERN SCHOLAR BE AN EXPERT ON CENTRAL AND EASTERN EUROPE?

© Aliaksei Kazharski
Ph.D., researcher and lecturer, Charles University, Faculty of Social Sciences
U Kříže 8, 158 00 Praha 5 — Jinonice, Czech Republic
E-mail: aliaksei.kazharski@fsv.cuni.cz
ORCID: https://orcid.org/0000-0002-9782-7746

*Abstract*: Following the 2022 full-scale invasion of Ukraine, the terms "Westsplaining" and "Westsplainer" gained momentum. They are used as a reaction to commentaries that are delivered by established Western intellectuals who lack proper knowledge of the region. Many people from Central and Eastern Europe, as well as some of their Western colleagues, tend to find such commentaries not only useless but also harmful. Far from being a purely theoretical academic contemplation, this type of commentary uses influential Western media forums to provide policy advice that is often based on false assumptions and projections. At the same time, some Westerners may feel wronged here, as the term "Westsplaining" could sound as a strong attempt to deny them the right to participate in expert debate based solely on their personal background. Without claiming a monopoly on the definition, the author attempts to explain why the term makes sense and how it can be used critically without being reduced to a vulgar *ad hominem*.

*Keywords*: Belarus, Central and Eastern Europe, knowledge production, Russia, Ukraine, Westsplaining,

This work is licensed under a Creative Commons Attribution-Noncommercial-No Derivative Works 4.0 International License

## Праблемы заходняй экспертызы

Пасля эскалацыі расійскай агрэсіі супраць Украіны да ўзроўню поўнамаштабнага ўварвання ў 2022 годзе тэрміны «ўэстсплэйнінг» (Westsplaining) і «ўэстсплэйнер» (Westsplainer), здаецца, набылі шырокую папулярнасць. Паняткі гэтыя, як відавочна, былі створаныя шляхам зліцця двух ангельскіх слоў, г. зн. West — Захад і explain — тлумачыць. Пошук літаральнага беларускага аналага, мабыць, прывёў бы нас да дзіўных моўных канструктаў кшталту «заходатлумачэння», таму на дадзеным этапе я, бадай, дазволю сабе пакінуць гэтую праблему беларускім філолагам і скарыстаюся адносна новым для беларускай мовы англіцызмам.

Вышэйзгаданыя тэрміны часта выкарыстоўваюць у адказ на каментарыі салідных заходніх інтэлектуалаў, сярод якіх трапляюцца і амерыканскія рэалісты (гл. Dutkiewicz & Smolenski 2023), і нямецкія ідэалісты, і, часамі, нават крытычныя канструктывісты з Ірландыі (Toal 2022). Шмат хто ў рэгіёне, які звычайна называюць Цэнтральна-Усходняй Еўропай, а таксама па-за яго межамі, на Захадзе, лічыць што гэтыя каментарыі не толькі не нясуць ніякай карысці, але з'яўляюцца наўпрост шкоднымі. Звязана гэта ў тым ліку з тым, што каментаванне гэтае не абмяжоўваецца чыста акадэмічнымі ці тэарэтычнымі развагамі. Уся моц заходніх медыяпляцовак выкарыстоўваецца для таго, каб даваць заўвагі і парады, якія часта грунтуюцца на няслушных дапушчэннях і хібных праекцыях.

Трэба, аднак, заўважыць, што некаторыя людзі з заходнім бэкграўндам могуць палічыць выкарыстанне гэтых тэрмінаў несправядлівым, паколькі яны могуць гучаць як спроба забараніць камусьці ўдзел у экспертных дыскусіях выключна на падставе асабістага бэкграўнду. Гэта, безумоўна, трэба браць да ўвагі. Вядома ж, я не прэтэндую на манаполію ў тым, што датычыцца дэфініцыі «ўэстсплэйнінгу». Тым не менш, я паспрабую растлумачыць, чаму, на маю думку, гэты тэрмін мае права на існаванне і як ім можна карыстацца без таго, каб не абрынуцца на ўзровень банальнага *ad hominem*.

## Ад мэнсплэйнінгу да ўэстсплэйнінгу: як нарадзілася партманто

Відавочна, што тэрмін «уэстсплэйнінг» быў утвораны па аналогіі з «мэнсплэйнінгам» (англ. mansplaining). Апошні таксама вынайшлі колькі гадоў таму, каб пазначыць супадзенне дзвюх рыс у мужчынскіх паводзінах: маскулінная самаўпэўненасці і неразумення

праблем, з якімі сутыкаюцца жанчыны (Solnit 2012). Тэрмін звычайна дастасоўвалі да выпадкаў, у якіх мужчына спрабаваў у аўтарытатыўнай манеры патлумачыць жанчыне штосьці, што яна і так ведае лепш за яго (Rothman 2012).

У прынцыпе, тэрмін можна разглядаць як частку значна больш шырокай тэндэнцыі ў крытычнай думцы, якая патрабуе ад нас рэфлексаваць над асабістым бэкграўндам удзельнікаў дыскусіі, прычым перш за ўсё над сваім уласным бэкграўндам, і задумвацца пра тое, як гэты бэкграўнд можа паўплываць на індывідуальнае бачанне свету. На сённяшні дзень, шмат хто ў сучасных сацыяльных навуках надае вялікае значэнне т. зв. *пазіцыянальнасці* (англ. positionality) даследчыкаў. Трэба адзначыць, што ўплыў т. зв. крытычнай тэорыі на даследаванні ў галіне сацыяльных навук не заўжды прыносіў станоўчыя вынікі, паколькі постмадэрнісцкая рэлятывізацыя эпістэмалогій акром іншага спрыяла і ўзмацненню ідэалагічнага ціску ў акадэмічным асяродку. Гэта, кажучы мякка, не заўжды вяло да падвышэння якасці акадэмічных дыскусій і апублікаваных навуковых тэкстаў (Mounk 2018; Morthorst Rasmussen 2020).

Акром таго, па-за межамі акадэмічнай «вежы са слановай косці», тэрміны кшталту мэнсплэйнінг ці ўэстсплэйнінг могуць быць лёгка выкарыстаныя як зброя, накіраваная не супраць аргументаў чалавека, а супраць яго асобы. Анлайн-абмеркаванні, напрыклад, добра паказваюць нам, што шмат людзей хутчэй няздольныя ўстаяць перад спакусай *argumentum ad hominem*.

Тым не менш, нам было б варта памятаць і пра запавет Дэльфійскага аракула: γνῶθι σαυτόν, г. зн. *спазнай сябе самога*. Узгадайма, што ён на тысячагоддзі старэйшы за любую постмадэрнісцкую крытычную тэорыю, і таму, у рэшце рэшт, рэфлексія над сабой і над уласнымі абмежаваннямі выглядае надзвычай карысным заняткам.

## «Уэстсплэйнінг» — гэта пра асабісты бэкграўнд?

Адразу спойлер: *не*, зусім не абавязкова.

Выкарыстанне тэрміну «мэнсплэйнінг», які быў тым самым першапачатковым партманто — г. зн. новым словам, утвораным з двух іншых слоў, — у прынцыпе, можна часткова абгрунтоўваць і наступным чынам. Акром розніцы ў сацыяльных ролях паміж мужчынамі і жанчынамі, якая часам можа быць даволі значнай,

гендарныя адрозненні таксама маюць свае карані ў досведзе, які можна лічыць, так бы мовіць, экзістэнцыйным і неперадавальным. Сюды трапляе, напрыклад, боль, які адчувае жанчына падчас нараджэння дзіцяці.

Аднак, у нашым выпадку мы маем справу з *культурнымі* адрозненнямі, якія, на шчасце, ніяк не звязаныя з біялогіяй. Нягледзячы на тое што даводзяць прыхільнікі Самюэля Хантынгтана і псеўданавуковай канцэпцыі «сутыкнення цывілізацый», культурныя адрозненні можна пераадольваць — хоць гэта і не адбываецца лёгка і бесклапотна, а часта вымагае значную колькасць часу і інтэлектуальнай працы.

Таму пытанне пра тое, ці можа «заходнік» быць экспертам па Цэнтральна-Усходняй Еўропе ці якімсьці іншым рэгіёне, відавочна мае рытарычны характар. Асабіста кажучы, маім улюбёным прыкладам заўжды быў нарвежскі даследчык міжнародных адносін Івер Б. Нойман (Iver B. Neumann). Яго даследаванні сувязяў паміж расійскай ідэнтычнасцю і знешняй палітыкай, на мой густ, прынамсі, сведчаць пра больш глыбокае разуменне праблематыкі, чым тое, якое даступнае шмат каму з расійцаў (Neumann 2017). І калі хутка агледзецца навокал, то ў поле зроку адразу трапляе многа падобных людзей, у т. л. Андрэас Умланд (Andreas Umland) ці Цімаці Снайдэр (Timothy Snyder), чые засцярогі пра ўздым фашызму ў Расіі мы, мабыць, не слухалі з належнай увагай, а таксама і цудоўная паліглотка Марсі Шор (Marci Shore), і бліскучая эрудытка Марлен Ляруэль (Marlène Laruelle) — і гэта толькі пара сусветнавядомых імёнаў у спісе, які можна было б працягваць досыць доўга.

Разам са шматлікімі іншымі заходнімі даследчыкамі, гэтыя людзі рэгулярна даказваюць нам, што іншы культурны бэкграўнд можа быць не перашкодай, а наадварот, выгодай. Аджа ён дапамагае нам пераадолець феномен т. зв. *слепаты на сваё*[1] (англ. home blindness, шведск. hemmablind), г. зн. няздольнасці заўважаць рэчы, да якіх мы доўгатэрмінова прызвычаеныя.

## То калі ўэстсплэйнінг не пра бэкграўнд, тады пра што?

Насамрэч, усё досыць проста. «Уэстсплэйнінг» азначае, што хтосьці выказваецца без дастатковых ведаў па тэме, але з пазіцыі аўтарытэту, і пры гэтым звычайна робіць хібныя праекцыі і няслушныя

1 Аўтар удзячны ўдзельнікам суполкі «Толькі пра мову» за дапамогу ў знаходжанні беларускага тэрміналагічнага адпаведніка.

дапушчэнні, якія засноўваюцца на *заходнім* досведзе, але не абавязкова пасуюць да іншых рэгіёнаў. Іншымі словамі, рэч тут не ў тым, адкуль мы паходзім геаграфічна і культурна. Важна тое, ці мы маем належныя веды, і ці, перад тым як пачаць раздаваць каментарыі, мы прыклалі грунтоўныя высілкі да вывучэння дадзенага рэгіёну, авалодалі тутэйшымі мовамі і набылі сапраўды глыбокае разуменне адпаведных краін, іх грамадстваў, гісторыі, палітыкі, культуры.

Аджа тут праблема, якая, напрыклад, існуе з ужо згаданымі выбітнымі амерыканскімі даследчыкамі са школы неарэалізму. Некаторыя з іх вельмі любяць каментаваць тэму Расіі і Украіны, але пры гэтым маюць досыць цьмянае разуменне сапраўдных рухавікоў расійскай знешняй палітыкі, не кажучы ўжо пра суцэльную гісторыю рэгіёна і яго асобных краін. У пэўнай ступені, такі неадказны падыход — гэта вынік, так бы мовіць, першароднага граху т. зв. «структурных» тэорый міжнародных адносін, да якіх належыць частка вышэйзгаданых рэалістаў. Яны, як вядома, дэманстратыўна ігнаруюць унутраную палітыку краін пры пабудове сваіх тэарэтычных канструкцый. Паводле іх меркавання паводзіны дзяржаў вызначаюцца, перш за ўсё, размеркаваннем сіл у міжнароднай сістэме, якое, калі і не прадвызначае паводзіны абсалютным чынам, то ў значнай ступені вымушае дзяржавы дастасоўваць падобныя стратэгіі выжывання, у незалежнасці ад тыпу палітычнага рэжыму і іншых унутраных чыннікаў (гл. Kazharski 2024).

Такі «структурны» падыход да разумення міжнародных адносін, пэўна ж, падаецца вельмі зручным, паколькі ён дазваляе каментаваць падзеі ў розных краінах і рэгіёнах у тым ліку тым, хто не мае пра іх дастатковых экспертных ведаў, але выказваецца з пазіцыі быццам бы ўніверсальнай тэорыі. І, нават выходзячы за межы школы рэалізму, тут назіраецца пэўнае супадзенне з досыць наіўным, але распаўсюджаным ліберальным вобразам глабалізаванага свету, дзе розныя культурныя і палітычныя кантэксты быццам бы маюць знаходзіцца ва ўсё большай паступовай канвергенцыі. Гэты вобраз стварае хібнае пачуццё ўніверсальнай «празрыстасці» глабалізаванага свету для даследчыкаў і аналітыкаў і адсоўвае на другі план важнасць экспертных ведаў па канкрэтных краінах і рэгіёнах, т. зв. краіназнаўства ці таго, што па-ангельску называюць *area studies*.

Аднак, пры больш блізкім вывучэнні, такія псеўда-ўніверсальныя тлумачэнні, што прапануюць нам некаторыя вядомыя заходнія даследчыкі, аказваюцца заснаванымі на пэўным кшталце інтэлектуальнага правінцыялізму. Гэты правінцыялізм прымае як дадзенае тое, што яго ўласныя дапушчэнні, зробленыя на падставе

заходняга досведу, маюць універсальнае дастасаванне. Напрыклад, вышэйзгаданым амерыканскім неарэалістам іх універсаліцкія тэорыі міжнародных адносін, здаецца, надаюць дастаткова самаўпэўненасці для таго, каб не толькі каментаваць, але і даваць парады датычна Украіны. У выніку, яны рэгулярна робяць шэраг надта наіўных дапушчэнняў што да Расіі і некрытычна прыпісваюць ёй формы рацыянальнасці, звязаныя з рэалісцкімі ўяўленнямі пра ўзважаны рацыянальны разлік і абачлівасць (англ. prudence), г. зн. тыя формы рацыянальнасці, якімі паводле рэалістаў меліся б кіравацца дзяржавы і іх кіраўнікі. Гэтыя ўзоры рацыянальных паводзін можна з лёгкасцю сустрэць у тэарэтычных пабудовах саміх рэалістаў, але, на жаль, іх часамі відавочна бракуе ў Крамлі — як яскрава прадэманстравалі падзеі 24 лютага 2022 г. Цікава, што апошняе даводзяць нават некаторыя аналітыкі, якія самі наўпрост звязаныя з расійскімі ўладнымі структурамі: паводзіны Расіі тут відавочна не супалі з базавымі чаканнямі рацыяналістаў (Timofeev 2022).

## Расійскацэнтрычнасць заходняга погляду як частка праблемы ўэстсплэйнінгу

Да ўсяго сказанага вышэй трэба дадаць, што заходні погляд на Цэнтральна-Усходнюю Еўропу сам па сабе досыць моцна скажоны сваім расійскацэнтрызмам (гл. Mälksoo 2023; Smoleński & Dutkiewicz 2022). Аджа зачаста ў мінулыя гады абмеркаванне розных краін рэгіёна пераходзіла у абмеркаванне таго, што на гэты конт лічыць Расія, ці развагі пра т. зв. «законныя інтарэсы» ці «законную сферу ўплыву» Масквы, і пра тое, як гэтыя інтарэсы трэба ўлічваць каб, крый божа, раптам не пакрыўдзіць ці не «прынізіць» Расію. Такі расійскацэнтрызм сапраўды з’яўляецца структурнай, сістэмнай праблемай у працэсе «прадукавання ведаў» (англ. knowledge production) у шматлікіх вымярэннях. Нават на ўзроўні дыскурсу СМІ гэта відавочна праяўлялася, напрыклад, у тым, што некаторыя заходнія рэдакцыі не бачылі асаблівай праблемы, калі іх замежныя карэспандэнты пісалі пра такія краіны як Беларусь, самі пры гэтым знаходзячыся ў Маскве. Відавочна і тое, што некаторыя заходнія акадэмічныя даследчыкі былі перакананыя, што для вывучэння постсавецкіх грамадстваў дастаткова ведання выключна расійскай мовы.

Калі глядзець на сувязі паміж прадукаваннем ведаў і палітыкай, то гэты погляд на рэгіён таксама шчыльна звязаны з тым, што даследчыкі міжнародных адносін называюць *great power*

*management*. Па-беларуску сэнс гэтага ангельскага тэрміна можна перадаць як кіраванне міжнароднай сістэмай праз прывілеі вялікіх дзяржаў, узорам для якога з'яўляецца т. зв. «канцэрт дзяржаў» у XIX стагоддзі. На практыцы гэта азначае, што моцныя міжнародныя гульцы меліся б дамаўляцца непасрэдна з Масквой, не зважаючы на меркаванні і інтарэсы меншых краін Цэнтральна-Усходняй Еўропы. Шэраг дыскусій, якія адбыліся ўжо пасля пачатку поўнамаштабнай расійска-ўкраінскай вайны, паказаў, што суб'ектнасць украінскага народа, як і іншых народаў Цэнтральна-Усходняй Еўропы, занадта часта застаецца ў цені рознага кшталту «геапалітычных» разваг, а таксама на першы погляд быццам бы разумных падыходаў, выпрацаваных аматарамі *great power management* у духу т. зв. «рэальнай палітыкі» (ням. Realpolitik). У гэтым пункце панятак «уэстсплэйнінг» зноў набліжаецца да першапачатковага «мэнсплэйнінг», паколькі за аўтарытэтным тонам, якім прамаўляе «ўэстсплэйнер», хаваецца сістэма іерархічных адносін, пабудаваных на няроўнасці. Адзінае што, у гэтым выпадку мы ўжо кажам пра няроўнасць паміж народамі і дзяржавамі.

## «Уэстсплэйнінг» — гэта выключна заходняя з'ява?

Не, зусім не. Здаецца, што схільнасць каментаваць без належных ведаў і разумення, гэта, на жаль, «чалавечае, надта чалавечае». Між іншым, гэтая схільнасць цалкам уласцівая і людзям, што жывуць на ўсходняй перыферыі Еўропы. У 2020 мне, так бы мовіць, «пашчасціла» назіраць за тым, як напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў шматлікія расійскія каментатары, у т. л. выразна дэмакратычных і празаходніх поглядаў, раптам пачалі цікавіцца Беларуссю — цікавіцца жвава, але крайне павярхоўна. Відавочна, што большасць гэтых людзей не сачылі паслядоўна за Беларуссю. У выніку атрымалася шмат таго, што, паводле аналогіі з «уэстсплэйнінгам», можна было б назваць «расіясплэйнінгам» што да Беларусі і яе аўтарытарнага рэжыму. Пэўна, моўная блізкасць з моцна русіфікаванай краінай сталася для расійскіх каментатараў своеасаблівай пасткай і дапамагала замацаваць ілжывае ўражанне празрыстасці тутэйшага кантэксту для выпадковага расійскага назіральніка. Характэрна, што і «дэсант» расійскіх паліттэхнолагаў, якіх Крэмль, як можна было здагадвацца, выправіў у Беларусь на дапамогу напрыканцы жніўня 2020, мабыць, трапіў у тую ж самую пастку культурнай (не)кампетэнтнасці, паспрыяўшы ўтварэнню агульнавядомага нецэнзурнага палітычнага мема (Халип 2020).

Тут абавязкова трэба зазначыць, што карані такога «расіясплэйнінгу» не толькі ў посткаланіяльнай спадчыне русіфікацыі постсавецкай прасторы, але і ў імпліцытным пачуцці палітычнай, сацыяльнай і культурнай прывілеяванасці, якое шмат расійцаў, хутчэй за ўсё, нават выразна і не ўсведамляюць. Расійская ментальная мапа рэгіёна была доўгія гады пад уплывам досыць цьмянага і ўнутрана двухсэнсоўнага канструкту т. зв. «ближнего зарубежья». Гэтае «бліжняе замежжа», па сутнасці, існавала ў расійскім калектыўным уяўленні як *лімінальная* прастора, якая адначасова ані належала поўнасцю да постсавецкай Расіі, ані знаходзілася адназначна па-за яе межамі. У выніку, прымалася як дадзенае тое, што на гэтай (пост)імперскай прасторы расійцам па вялікім рахунку проста не было чаго не ведаць ці не разумець.

## Пастка «расіясплэйнінгу» і постсаветыкум

Можна сказаць, што ў выніку гэтых калектыўных ілюзій расійцы часта не надавалі асаблівай увагі ведам пра лакальную рэальнасць суседніх краін. Гэта датычылася і людзей, адказных за прыняцце рашэнняў што да Украіны: іх, відавочна, даволі мала цікавіла, што там сапраўды адбываецца ў плане палітыкі, культуры і працэсаў паступовага фармавання ўкраінскай нацыі. Першапачатковы разлік пуцінскай т. зв. «спецыяльнай аперацыі» быў на тое, што ўлада ў Кіеве хутка зменіцца, а ўкраінская дзяржава проста абрынецца пад расійскай навалай як картачны домік. Драматычная параза Масквы ва Украіне, дзе, насуперак сваім чаканням, расійскія сілы сустрэліся з ярасным супрацівам кансалідаванага ўкраінскага народа, у рэшце рэшт, мае свае карані ў гэтай звычцы ігнараваць рэальнасць. Пагардлівая імперыялістычная манера глядзець на суседзяў як на нешта непаўнавартаснае, другаснае і не вартае ўвагі — гэта таксама інтэгральная частка «расіясплэйнінгу», яго аснова.

На жаль, тут я мушу дадаць, што і ўкраінцаў таксама не абышла гэтая ўніверсальная хвароба. Пачынаючы з 2020 года, шматлікія ўкраінскія каментатары засвоілі паблажлівы, а часам і зняважлівы тон што да ўдзельнікаў беларускіх пратэстаў, якія, быццам бы, проста «не ўмеюць» ці «не хочуць» рабіць т. зв. «майдан». У гэтым стаўленні да беларусаў праявілася поўнае ігнараванне розніцы паміж украінскім досведам арганізацыі народных «рэвалюцый» у алігархічнай дэмакратыі, і беларускім досведам з 2020, калі стыхійнаму пратэстнаму руху супрацьстаяла кансалідаваная

аўтакратыя, якую, да таго ж, у крытычныя моманты прама падтрымліваў Крэмль.

Як і ў іншых выпадках, гэты «ўкрасплэйнінг» Беларусі безумоўна мае свае карані ў дэфіцыце ведаў пра паўночнага суседа і ў звязаных з ім наіўных дапушчэннях, што ўнутрыпалітычная сітуацыя ў Беларусі больш-менш нагадвае сітуацыю ва Украіне. На жаль, новае жыццё гэты дыскурс атрымаў у 2022 годзе, пасля таго як аўтарытарны рэжым дазволіў выкарыстаць беларускую тэрыторыю для расійскага нападу на Украіну. Як заўважыў, і, мабыць, не зусім беспадстаўна на той момант, украінскі аўтар Паўло Зуб'юк, украінскія каментарыі што да Беларусі часта бываюць сумессю базавага неразумення і шавінізму (Зуб'юк 2022).

## Хвароба ўніверсальная, але «ўэстсплэйнінг» нясе асаблівую шкоду

У рэшце рэшт, здаецца, што тыя ці іншыя формы «-сплэйнінгу» ўласцівыя, бадай, усім. Аднак, я вярнуся да першапачатковага аргументу, які лічу больш важным у нашым рэгіянальным кантэксце. Мне падаецца, што тэрмін «уэстсплэйнінг» можа быць карысным, але толькі тады, калі ён скіраваны не супраць непасроднага бэкграўнду ўдзельнікаў дыскусіі, а, хутчэй, супраць абмежаванасці іх экспертных ведаў, асабліва калі гэтая абмежаванасць спалучаецца з іх манерай выступаць самапрызначанымі экспертамі па тэмах, з якімі яны відавочна недастаткова працавалі. На жаль, як я даводзіў вышэй, усе мы часамі маем тэндэнцыю выказваць думкі па пытаннях, у якіх, як нам самім падаецца, мы цудоўна разбіраемся. Аднак, адметная праблема, якая існуе з некаторымі заходнімі каментатарамі па тэмах Цэнтральна-Усходняй Еўропы і, у прыватнасці, расійска-ўкраінскай вайны, палягае ў тым, што выказванні гэтых каментатараў непараўнальна больш уплывовыя на міжнароднай арэне. Для прасоўвання сваіх поглядаў уэстсплэйнеры могуць карыстацца самымі вядомымі еўрапейскімі і паўночнаамерыканскімі медыяпляцоўкамі з глабальным ахопам аўдыторыі. Гэтая перавага вяртае нас да першапачатковай паралелі паміж «уэстсплэйнінгам» і «мэнсплэйнінгам», паколькі мы зноў сутыкаемся з няроўнасцю. У гэтым выпадку мы можам казаць пра няроўнасць, якая ўбудаваная ў сучасную міжнародную сістэму і мае прамы адмоўны ўплыў на працэс прадукавання ведаў. Гэта праблема, якая з'яўляецца важнай часткай дыскусій пра дэкаланізацыю альбо дэімперыялізацыю, распачатых у рэгіёне і па-за яго межамі пасля 2022.

Першапачатковая версія тэксту была апублікаваная 19 ліпеня 2022 г. па-ангельску платформай Forum for Ukrainian Studies пад назвай Explaining the «Westsplainers»: Can a Western scholar be an authority on Central and Eastern Europe? https://ukrainian-studies.ca/2022/07/19/explaining-the-westsplainers-can-a-western-scholar-be-an-authority-on-central-and-eastern-europe/

Аўтар дзякуе рэдактарам платформы за дазвол надрукаваць беларускі пераклад з дапаўненнямі.

## References

Dutkiewicz, J. & Smoleński, J. (2023). Epistemic superimposition: the war in Ukraine and the poverty of expertise in international relations theory. *Journal of International Relations and Development* 26 (4): 619–631. https://doi.org/10.1057/.s41268-023-00314-1.

Kazharski, A. (2024). On "Westsplaining," Realism, and Technologies of the Self: A Foucauldian Reading of the Realist Commentary on Ukraine. *Journal of Regional Security* 19 (1): 77-96. https://doi.org/10.5937/jrs19-48501.

Khalip, I. (2020). Yabat'ki. Osnovnyye priznaki rossiĭskogo prisutstviya v Belarusi. *Novaya gazeta*, 22 avgusta. https://novayagazeta.ru/articles/2020/08/22/86782-yabatki (accessed: August 4, 2024). — In Russ.

[Халип, И. (2020). Ябатьки. Основные признаки российского присутствия в Беларуси. *Новая газета*, 22 августа.]

Mälksoo, M. (2023) The Postcolonial Moment in Russia's War Against Ukraine. *Journal of Genocide Research* 25 (3-4): 471-481. https://doi.org/10.1080/14623528.2022.2074947.

Morthorst Rasmussen, D. (2020). Peace researcher Ole Wæver accused of racism: "I've never felt so bad about my life as an academic." *University of Copenhagen*, May 15. https://uniavisen.dk/en/prominent-peace-researcher-accused-of-racism-ive-never-felt-so-bad-about-my-life-as-an-academic/ (accessed: August 5, 2024).

Mounk, Y. (2018). What an Audacious Hoax Reveals About Academia. *The Atlantic*, October 5. https://www.theatlantic.com/ideas/archive/2018/10/new-sokal-hoax/572212/ (accessed: August 5, 2024).

Neumann, I. B. (2017). *Russia and the Idea of Europe. A Study in Identity and International Relations*. New York, NY: Routledge.

Rothman, L. (2012). Cultural History of Mansplaining. *The Atlantic*, November 1. https://www.theatlantic.com/sexes/archive/2012/11/a-cultural-history-of-mansplaining/264380/ (accessed: August 5, 2024).

Solnit, R. (2012). Men Still Explain Things to Me. *The Nation*, August 20. https://www.thenation.com/article/archive/men-still-explain-things-me/ (accessed: August 5, 2024).

Smoleński, J. & Dutkiewicz, J. (2022). The American Pundits Who Can't Resist "Westsplaining" Ukraine. *Politics*, March 4. https://newrepublic.com/article/165603/carlson-russia-ukraine-imperialism-nato (accessed: August 5, 2024).

Timofeev, I. (2022). Why Experts Believed an Armed Conflict with Ukraine Would Never Happen. *Russian International Affairs Council*, March 4.

https://russiancouncil.ru/en/analytics-and-comments/analytics/why-experts-believed-an-armed-conflict-with-ukraine-would-never-happen/ (accessed: August 5, 2024).
Toal, G. (2022). War can be ended, but peace would be tough for Ukraine to swallow. Defeating Putin in long run means accepting face-saving Russian 'victory' in immediate term. *The Irish Times*, March 12. https://www.irishtimes.com/opinion/war-can-be-ended-but-peace-would-be-tough-for-ukraine-to-swallow-1.4824457 (accessed: August 5, 2024).
Zub'iuk, P. (2022). Persha ukrayinsko-biloruska viyna. Chomu Vasyl Bykov potrapyv pid zaboronu? *Zaxid.Net*, 5 lypnia. https://zaxid.net/statti_tag50974/ (accessed: August 5, 2024). — In Ukr.
[Зуб'юк, П. (2022). Перша українсько-білоруська війна. Чому Василь Биков потрапив під заборону? *Zaxid.Net*, 5 липня.]